# МАЦКЕВІЧ ВЯЧАСЛАЎ КАНСТАНЦІНАВІЧ




**Мацкевіч Вячаслаў Канстанцінавіч** (1.01.1944, в. Утканы Воранаўскага р-на), беларускі музыкант (баян, гармонік), музычны педагог, дырыжор аркестра. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1990). З сялянскай сям'і. Скончыў СШ ў Канвелішках (Воранаўскі р-н), музычна-педагагічную вучэльню ў Гродне (1965), інстытут культуры ў Ленінградзе. Выкладаў музыку і спевы ў Забалацкай СШ Воранаўскага р-на (1965-68). Затым працуе выкладчыкам Воранаўскай дзіцячай музычнай школы, з 1980 — дырэктарам школы. З пачатку педагагічнай працы стварае калектывы музычнай самадзейнасці (хоры, аркестры), збірае мясцовы музычны фальклор. У 1981 г. арганізуе і ўзначальвае фальклорны інструментальны ансамбль "Лявоны" (з 1985 — званне народнага), які выконвае музыку рэгіёна, творы розных народаў. Пад кіраўніцтвам В. Мацкевіча ансамбль стаў лаўрэатам міжнародных конкурсаў, выступаў у Беларусі, Германіі,Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Азербайджане, ЗША.

**Бібліяграфія:**


1. Пяткевіч, А. М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік / А.М.Пяткевіч. — Гродна, 2000. —384с.